**К. Рулеўская**

# ЖАНЧЫНЫ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ: ПРЫГОЖЫЯ АХВЯРЫ АЛЬБО САМААДАННЫЯ ПАТРЫЁТКІ

Ніхто не ставіць пад сумнеў тэзіс пра ўклад беларускага народа ў Вялікую Перамогу. Але якую ролю насамрэч адыгралі жанчыны ў Вялікай Айчыннай вайне ў Беларусі, якую смеласць і самаахвярнасць праявілі яны ў паўсядзённым жыцці на акупаванай тэрыторыі, а не толькі ў шэрагах байцоў Чырвонай арміі ці партызан і падпольшчыкаў?

Сучасныя бібліятэчныя фонды захоўваюць безліч літаратуры, шматлікія зборнікі дакументаў і матэрыялаў пра подзвігі жанчын у тыле, на фронце, у падполлі. СССР быў адзінай дзяржавай у гады Другой сусветнай вайны, дзе жанчыны прымалі непасрэдны ўдзел у ходзе баявых дзеянняў. На фронце ў розныя часы змагаліся ад 800 тыс. да 1 млн жанчын. Гэта было абумоўлена шэрагам прычын:

- гэта была небывалая праява патрыятызму жанчын, якія рваліся ў бой з акупантамі.
- адной з галоўных прычын стала цяжкая сітуацыя, якая склалася на ўсіх франтах.

Мабілізацыі падлягалі дзяўчыны ва ўзросце ад 18 гадоў. Савецкі грамадскі і партыйны дзеяч М. І. Калінін, згадваючы пра «жаночыя прызывы», адзначаў: «Я думаю, што лепшая частка нашай жаночай моладзі пашла на фронт…»

СССР ганарылася такімі гераінямі савецкага народа, як Л. Чайкіна, А. Пятрова, М. Меленцьева, Л. Шаўцова, Л. Паўлічэнка... і іншымі. За свае подзвігі ў часы вайны 95 жанчын сталі Героямі Савецкага Саюза.

Але не толькі ў баях праяўлялася мужнасць і самаадданасць жанчын. Сярод тых, хто апынуўся на акупаванай тэрыторыі Беларусі, таксама ёсць імёны, якія нельга абаходзіць маўчаннем. Гэта жанчыны-матулі, якія вырасцілі сваіх сыноў-абаронцаў Айчыны, але пасля вайны засталіся без сваіх блізкіх мужчын. У беларускім пантэоне памяці першы радок займае імя А. Ф. Купрыянавай, якая адправіла на фронт пяць сваіх сыноў і не дачакалася ні аднаго з іх. Моцная духам маці-патрыётка стала сімвалам мужнасці, самаахвярнасці і патрыятызму ў Беларусі.

Да 20-годдзя Вялікай Перамогі Прэзідыум ЦК КПСС унёс прапанову аб тым, каб Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка стаў святочным непрацоўным днём «у азнаменаванне выдатных заслуг савецкіх жанчын... у абароне Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, іх гераізму і самаахвярнасці на фронце і ў тыле...».

Звяртаючыся да дадзенай гістарычнай тэмы, неабходна адзначць, што яна вельмі шырокая, шматгранная і пакуль што недастаткова адлюстраваная ў навуковай літатаруты. Кожны павінен памятаць пра патрыятызм і сапраўды мужную барацьбу белдарускіх жанчын, якія ахвяравалі ўсім, каб дайсці да перамогі і прынесці мір сваім нашчадкам.